ГУО «Средняя школа № 11 г. Лиды»

# Школьная газета «Большая перемена»

Выпуск 8 (148), апрель 2021 года.

Читайте нас https://11lida.schools.by/pages/press-tsentr

Содержание выпуска:

Стр. 2 Берегите себя и свои деньги!
Гадзіна выдатнай асобы “Душы маёй прызванне”
Стр. 3 Палятаць не ў марах, а амаль рэальна змаглі вучні адзінаццатай лідскай школы
Стр. 3-4 Весенняя антинаркотическая акция "Миссия жить"
Стр. 4 Чернобыль и боль. Творческие проекты учащихся СШ № 11 г. Лиды признаны лучшими на областном этапе конкурса
Стр. 5 В рамках акции "ПРАВОзнание: думай, решай, выбирай"
Стр. 6 ЕДИ ШАГ «Есть в каждой Победе твоей и моей: весна 45-го года»
Выставку «Интеллектус» посетил 6 А
Стр. 7 Адкрыты дыялог "Чарнобыль: лёсы, падзеі, памяць"
Стр. 8 ШАГ О духовных и нравственных ценностях: диалог поколений
Стр. 9 Помнікі гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі праз аб’ектыў фотакамер
Стр. 10 “VIII Лідскія чытанні”
Стр. 11 Дапаможам разам хворым дзецям і зробім нашу прыроду чысцей!
Стр. 12 Тыдзень лесу – 2021
"Вытокі.Крок да Алімпу"
Стр. 13 Пазнаёміліся з працай метролагаў у Лідскім цэнтры стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі
Стр. 14 Стоп кадр
Дорога к храму













**Больше фото смотрите на сайте школы во вкладке «Фотоальбомы»: https://11lida.schools.by/photoalbums**

# Берегите себя и свои деньги!

В рамках международной недели финансовой грамотности «Global money week – 2021» учащиеся 6 и 8 классов СШ № 11 г. Лиды встретились с представителем «Франсабанка». Главный акцент на занятиях был сделан на цифровую грамотность в финансовой сфере, которому соответствовал слоган «Береги себя и свои деньги!»



Во время занятий сотрудник регионального подразделения «Франсабанка» в городе Лиде, специалист по продажам центра банковских услуг, Екатерина Груца, рассказала учащимся о значимости в жизни современных людей дистанционного банковского обслуживания, о правильном пользовании платёжными гаджетами, возможностью оплаты с помощью QR-кода и о многом другом. С особым интересом школьники слушали проблемы, касающиеся социальной инженерии. Эта тема вызвала у учащихся ряд вопросов, на которые они смогли получить компетентные ответы от специалиста. Получили школьники рекомендации и советы, связанные с проблемой взлома страниц социальных сетей. А так как многие подростки являются их активными пользователями, советы для них стали просто необходимы.

При проведении занятий учащимся были предложены памятки, представлены презентация и материалы, разработанные Национальным банком Республики Беларусь.

Юнкоры 8 «Б» класса

# Гадзіна выдатнай асобы “Душы маёй прызванне”

У *Лідскай раённай бібліятэцы імя Янкі Купалы* прайшла гадзіна выдатнай асобы “Душы маёй прызванне”, прысвечаная ***135-годдзю з дня нараджэння Змітрака Бядулі***. На мерапрыемства былі запрошаны навучэнцы 8 класа ДУА “Сярэдняя школа № 11 г. Ліды”.



Дзецям расказалі аб жыцці і творчасці вядомага беларускага паэта, празаіка і мовазнаўцы, а таксама паказалі мультымедыйную прэзентацыю “Душы маёй прызванне” і распавялі, якія кнігі пісьменніка ёсць у фондзе бібліятэкі.



Пасля мерапрыемства школьнікі здзейснілі экскурсію па бібліятэцы, паглядзелі працу аддзела абслугоўвання і інфармацыі, ім распавялі аб прафесіі бібліятэкара і аб тым, дзе можна атрымаць адукацыю па гэтай спецыяльнасці.

# Палятаць не ў марах, а амаль рэальна змаглі вучні адзінаццатай лідскай школы



Усе дзеці і дарослыя мараць хоць раз у жыцці пасядзець у кабіне самалёта. А кіраваць ім у паветры – гэта нешта падобнае да міра фантастыкі. Навучэнцы 8 і 10 класаў сярэдняй школы № 11 г. Ліды змаглі не проста здзейсніці свае мары, а амаль рэалізаваці іх у жыцці.

У рамках рэгіянальнага праекта "#Эканоміка. Асоба. Будучыня" школьнікі наведалі 116-штурмавую авіяцыйную базу. Падлеткі не толькі даведаліся пра жыццё вайсковай часткі, паназіралі за працэсам падрыхтоўкі лётчыкаў на Су-25 і Л-39, але і на практыцы змаглі адчуць усе хваляванні ад палёту. Хлопцы і дзяўчаты ажыццявілі свае даўнія дзіцячыя мары: ім было дазволена сесці за штурвал трэнажора вучэбна-баявога самалёта ЯК-130 і кіраваць авіямашынай на працягу пэўнага часу. Пралятаючы над горадам, вучні ўбачылі знаёмыя вуліцы, будынкі, а пакінуўшы горад, іх вачам адкрыліся неверагодныя краявіды лясоў, палеткаў, рэк, вадаёмаў.



Наведалі школьнікі і музей самалётаў пад адкрытым небам, дзе ўбачылі авіяцыйную тэхніку розных гадоў. Зазірнулі ў казармы і змаглі ацаніць умовы жыцця сучасных салдат, якія праходзяць службу на тэрыторыі часткі.

Вялікую падзяку выказваюць навучэнцы і педагогі адзінаццатай школы кіраўніцтву авіябазы і арганізатарам экскурсіі за неверагодныя эмоцыі. Кожны падлетак, вяртаючыся да хаты і дзелячыся ўспамінамі, у душы адчуў пачуццё гонару за беларускую авіяцыю!

Юнкоры 8Б класса









# Весенняя антинаркотическая акция "Миссия жить"

В рамках весенней антинаркотической акции "Миссия жить!" в Государственном учреждении образования "Средняя школа 11 г. Лиды" прошла встреча учащихся VIII - IX классов с инспектором ИДН Лидского РОВД Долженковым Дмитрием Викторовичем. Учащиеся узнали о негативном влиянии наркомании на здоровье, а также об ответственности за распространение и употребление запрещенных средств.

# Чернобыль и боль. Творческие проекты учащихся СШ № 11 г. Лиды признаны лучшими на областном этапе конкурса

**Республиканским центром экологии и краеведения и Гродненским областным центром туризма и краеведения был объявлен республиканский проект «Чернобыль: сквозь призму десятилетий» и в рамках его творческий конкурс. В областном его этапе в числе призеров отмечены две работа лидчан – учащихся СШ №11.**

Работа восьмиклассниц СШ №11 Дарьи Белоус, Ксении Краснодубской и Елены Лычковской (классный руководитель Наталья Анашкевич) «Чернобыль в судьбах людей» вобрала многие истории лидчан, участников ликвидации последствий катастрофы, переселенцев из Чернобыльской зоным. Отрадно, что основным источником информации для школьников стала «Лідская газета», на страницах которой в разные годы эти истории были опубликованы. Так, в конкурсной работе они рассказали о судьбе подполковника в отставке Валерия Завирухина – участника ликвидации последствий на ЧАЭС, а также судьбе бывшего милиционера Виталия Аксенова – тогда, в 1986-м, ему было всего 25, и он в числе 35 сотрудников правоохранительных органов со всей Беларуси вошел в состав взвода, направленного в чернобыльскую зону, о судьбе семьи Михаленко, Шполянских и многих других, вынужденных сорваться с обжитых мест и уезжать в другие регионы.









## Весенняя антинаркотическая акция "Миссия жить"

В рамках весенней антинаркотической акции "Миссия жить" старшеклассники СШ #11 провели акцию "ВЕК без наркотиков". Учащиеся распространили информационные буклеты и памятки среди населения города. В стенах школы провели акцию "Мы выбираем жизнь без наркотиков!", проинформировав учащихся школы о пользе здорового образа жизни.

# В рамках акции "ПРАВОзнание: думай, решай, выбирай"

26 апреля в СШ 11 в рамках акции "ПРАВОзнание: думай, решай, выбирай" стартовала информ-платформа «В будущее без зависимостей", в рамках которой перед старшеклассниками выступил врач-волеолог Центра дружественного детям Иван Антонович Выдронюк, который рассказал о последствиях вредных зависимостей.



## Отряд ЮПМ в действии




27 апреля в ГУО «Средняя школа 11 г. Лиды» членами отряда ЮПМ “Правопорядок» в течение дня (на переменах и после уроков) в рамках правовой перемены “Жизнь по закону» среди учащихся распространялись актуальные буклеты. Красочные памятки на правовую тематику были размещены на стендах в классах (6-9 классы). Ребята принимали активное участие в правовой перемене, делали фото и селфи, пополняли свою копилку знаний по правовым вопросам, закрепляли навыки законопослушного поведения!

23 апреля в Государственном учреждении образования "Средняя школа 11 г.Лиды" стартовала акция " ПРАВОзнание: думай, решай, выбирай". Учащиеся активно включились в мероприятия перемены "Жизнь по закону". Члены отряда ЮПМ распространили информационные листовки по профилактике кибербуллинга, троллинга, сваттинга.






22 апреля в СШ№11 г. Лиды для учащихся 8-11 классов прошёл ЕДИ «ШАГ» на тему «Есть в каждой победе твоей и моей весна сорок пятого года». Гостем встречи стала жительница блокадного Ленинграда Евгения Петровна Барташевич, которая поделилась с учащимися воспоминаниями о тех испытаниях, которые ей пришлось пережить в годы Великой Отечественной войны. В рамках открытого диалога участники ШАГа размышляли о том, для чего нам необходимо помнить и чтить подвиг народа.

## Выставку «Интеллектус» посетил 6 А

На выставке «Интеллектус» в ЛИХМ представлена удивительная коллекция головоломок, которую высоко оценили учащиеся VI А класса СШ 11, любители интеллектуального досуга. Удобно устроившись за специальным столиком, ребята посвятили какое-то время на развитие сообразительности, внимания и логического мышления, при этом отдыхая...

Очень заинтересовали плакаты с различными визуальными иллюзиями, расширяющими человеческое восприятие реальности. У учащихся вызвали восторг и научные экспонаты, представленные на выставке- стул йога, рычаг Архимеда, маятник Фуко, мост Да Винчи (который одновременно является головоломкой), которые добавили ещё больше интересной информации к размышлению.

Юнкоры 6А класса



# Адкрыты дыялог "Чарнобыль: лёсы, падзеі, памяць"

**Напрыканцы красавіка ў школах Лідскага раёна праходзіла дэкада грамадска-патрыятычных спраў “Чарнобыль. Праз 35 гадоў”. Шэраг мерапрыемстваў быў арганізаваны і ў сярэдняй школе № 11 Ліды. Адным з самых значных і цікавых для вучняў 7–9-х класаў стаў удзел у адкрытым дыялогу “Чарнобыль: лёсы, падзеі, памяць”.**



Падчас мерапрыемства ўвазе школьнікаў была прадстаўлена даследчая праца вучняў 8 “Б” класа “Лёсы людзей пад крылом чарнобыльскай трагедыі”, якая заняла 2-е месца на абласным этапе рэспубліканскага праекта “Чарнобыль: скрозь прызму дзесяцігоддзяў”. Аўтары даследчай працы пазнаёмілі ўдзельнікаў адкрытага дыялогу з жыццёвымі гісторыямі лідчан, якія з’яўляліся ўдзельнікамі ліквідацыі наступстваў катастрофы, з лёсамі перасяленцаў з Чарнобыльскай зоны.



Трэба адзначыць, што асноўнай крыніцай інфармацыі для школьнікаў стала раённае выданне “Лідская газета”, на старонках якой у розныя гады гэтыя гісторыі былі апублікаваныя. Юныя даследчыкі сабралі ўвесь матэрыял, правялі шэраг абмеркаванняў, вызначылі ключавыя моманты – у выніку ўсяго даследчая праца стала абагульняючай і грунтоўнай.

Так, выступаючы перад навучэнцамі, васьмікласнікі распавялі пра лёс падпалкоўніка ў адстаўцы Валерыя Завірухіна – удзельніка ліквідацыі наступстваў на ЧАЭС, а таксама пра лёс былога міліцыянера Віталя Аксёнава – тады, у 1986, яму было ўсяго 25, і ён у ліку 35 супрацоўнікаў праваахоўных органаў з усёй Беларусі ўвайшоў у склад узвода, накіраванага ў Чарнобыльскую зону. Пра лёс сямей Бяспятых, Міхаленкаў, Шпалянскіх і многіх іншых, вымушаных сарваццца з абжытых месцаў і з’язджаць у іншыя рэгіёны.

Праслухаўшы матэрыялы даследавання, вучні задалі пытанні і атрымалі кампетэнтныя адказы ў ходзе абмеркавання сумесна з класнымі кіраўнікамі.




Таксама школьнікі віртуальна наведалі памятныя месцы Беларусі, дзе ўвекавечаны ў камені падзеі 35-гадовай даўніны. Віртуальнае падарожжа вучням прапанавала зрабіць інфармацыйная група 8 “Б” класа.

І ячшэ адным уражлівым момантам для ўсіх стала прапанова наведаць віртуальна мастацкую галерэю, дзе намаганнямі вучняў 7 “Б” класа сабраны карціны беларускіх мастакоў, прысвечаныя тэме чарнобыльскай трагедыі. Вучні не проста зрабілі агляд карцін, а пачулі іх гісторыі, адчулі боль і трагедыю, якую перадалі на сваіх палотнах мастакі.

# О духовных и нравственных ценностях: диалог поколений

8 апреля в Государственном учреждении образования «Средняя школа №11 г. Лиды» с участием учащихся 8-11 классов прошёл единый день информирования в рамках информационно-образовательного проекта «Школа Активного Гражданина». В фокусе обсуждения тема «О духовных и нравственных ценностях: диалог поколений».















**В ходе ШАГа 1** инициативная группа учащихся 11 класса выступила с сообщениями: Арина Белоус познакомила участников ШАГа с историей премии «За духовное возрождение», Павел Король рассказал о подвижнической просветительской деятельности митрополита Филарета, почетного Патриаршего экзарха всея Беларуси, который внёс большой личный вклад в духовное возрождение белорусского общества, развитие отношений между церковью и государством, воспитание в людях милосердия и христианских ценностей, возрождение храмов и церквей в Беларуси.

Члены школьного пресс-центра, учащиеся 8 класса, выступили с сообщениями о людях нашей страны, жизнь и деятельность которых стала примером нравственности и гуманизма. Выступления учащихся сопровождалось мультимедийной презентацией «Славные люди земли белорусской», подготовленной самими учащимися.

**В обсуждении вопросов** духовных и нравственных ценностей принял участие настоятель храма Всех Святых протоиерей Владимир Яромич. Выступая перед аудиторией молодых людей, священнослужитель отметил, что сейчас, когда материальные ценности доминируют над духовными, у многих людей искажены представления о доброте, милосердии, великодушии, справедливости, гражданственности и патриотизме. Основой внутреннего мира каждого человека всегда являются нравственные ценности, которые занимают особое место среди множества проявлений человеческой духовности. Поэтому сегодня вопросы духовно-нравственного характера активно поднимаются и обсуждаются. В качестве примера и назидания молодым людям отец Владимир напомнил содержание притчи о блудном сыне, где очень точно раскрываются и отношения поколений, и значение нравственности в жизни человека. Общаясь со священником, учащиеся нашли ответы на ряд вопросов, которые смогли задать в ходе диалога поколений.

**В ходе реализации ШАГа 3** руководитель волонтёрского отряда «Милосердие» Наталья Юрьевна Лукомская поделилась опытом по реализации волонтерских проектов и познакомила учащихся с планами на ближайшее время.

Подводя итог встречи, руководитель информационного центра школы Светлана Леонидовна Белявская отметила, что молодые люди сами смогут сделать достойный выбор в разрешении фундаментальных вопросов человеческой жизни. Главное, чтобы духовный и нравственный выбор был свободным и обдуманным, опирающимся на совесть.

И взрослые, и учащиеся – представители двух поколений - отметили актуальность и значимость духовно-нравственного развития молодежи в современном обществе

# Помнікі гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі праз аб’ектыў фотакамер

Не першы год вучні 8 “Б” класа Сярэдняй школы № 11 г. Ліды да прымаюць актыўны ўдзел у святкаванні Міжнароднага дня помнікаў і гістарычных месцаў.

Так, усім добра запомніўся удзел ў квэсце “Падарожжа па вуліцы Віленскай”, дзе школьнікі змаглі пазнаёміцца з самай старажытнай вуліцай роднага горада і даведацца аб аб’ектах, якія сёння з’яўляюцца візітнымі карткамі горада Ліды. Мінулы год вучні прайшлі пешаходнай экскурсіяй “Лідскімі дарогамі Валянціна Таўлая”. Шмат цікавых фактаў з жыцця паэта пачулі яны і ўбачылі ўласна мясціны, дзе жыў, працаваў і, нават, сядзеў за кратамі ў часы Вялікай Айчынай вайны Валянцін Паўлавіч.

У гэтым годзе фармат удзелу быў зменены. Напярэдадні свята, а адзначаецца гэты дзень ва ўсім свеце 18 красавіка, вучні ў шосты школьны дзень арганізавалі фотавыставу “Помнікі гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі”. Трэба сказаць, што васьмікласнікі ўжо чацвёрты год з’яўляюцца членамі школьнага прэс-цэнтра “Вялікі перапынак”, і менавіта на чарговым занятку яны правялі імпрэзу сваіх фотаздымкаў, зробленых падчас падарожжаў па розным куткам радзімы. Кожны з юных фотамастакоў падзяліўся сваімі ўраджаннямі ад убачаных выяў і з задавальненнем расказаў, дзе і калі яны зрабілі свае фотаздымкі. Такім чынам, вучні нават змаглі правесці невялікую інтэлектуальную гульню “Што? Дзе? Калі?”

А на здымках, сапраўды, можна было ўбачыць гісторыка-культурныя аб’екты розных куткоў Беларусі: Сафійскі сабор ў Полацку, Мірскі і Нясвіжскія замкі, касцёл Святой Троіцы ў Гервятах, Сынкавічскую царкву, царкву ў Мураванцы, сабор Святога Архангела Міхаіла ў Лідзе, Каложскую царкву і шмат іншых цікавых аб’ектаў.



Абмен ураджаннямі выклікаў ў васьмікласнікаў жаданне працягнуць знаёмства з помнікі гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі і на летніх канікулах абавязкова здзейсніць сямейныя падарожжы, каб уласна бачыць іншыя цікавыя будынкі і аб’екты Радзімы.

Юнкоры 8 “Б” класса
Сярэдняй школы № 11 г. Ліды



# Падзеі часоў Вялікай Айчынай вайны ў цэнтры ўвагі юных даследчыкаў і настаўнікаў Сярэдняй школы № 11 г. Ліды

Ужо восьмы год запар як у канферэнц-зале Цэнтральная раённай бібліятэкі імя Я.Купалы праходзіць навукова-практычная канферэнцыя “VIII Лідскія чытанні”. Удзельнікамі канферэнцыі з’яўляюцца краязнаўцы, супрацоўнікі ДУ “Лідскі гісторыка-мастацкі музей”, настаўнікі і юныя даследчыкі, навучэнцы сярэдніх школ горада і раёна. У гэтым годзе ўдзельнікам чытанняў была прапанавана тэма «Вайна і памяць: старонкі гісторыі Лідскага краю", прымеркаваная да 80-годдзя пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

Навучэнцы і настаўнікі Сярэдняй школы № 11 г. Ліды штогод прымаюць удзел у працы “Лідскіх чытанняў”, ім ёсць чым падзяліцца з грамадскасцю горада, ёсць, чым уразіць. У гэтым годзе увазе слухачоў навукова-практычнай канферэнцыі яны прапанавалі матэрыялы трох даследаванняў. Так, вучаніца 7Б класа Дар’я Усс пазнаёміла з матэрыяламі даследчай працы “Злачынства фашызму: Халакост на Лідчыне” (кіраўнік працы Кацярына Вячаславаўна Валынец). У выступленні Дар’я распавяла гаворку аб тым, як прыйшла вайна на Лідскую зямлю, як адбілася на мірнай да гэтага дня жыцця жыхароў Лідчыны, і якія яе трагічныя наступствы.





Вучаніцы 8Б класа Алена Лычкоўская і Юнда Ганна расказалі аб праекце “Дарогі Лідчыны, абпалены вайной. Яны застылі ў абелісках, стэлах і мемарыялах", у якім увекавечваюцца імёны людзей, унёсшых уклад у Вялікую Перамогу, тых жыхароў г. Ліды і Лідскага раёна, чые імёны ўвекавечаны ў абелісках і мемарыялах. Над праектам вучаніцы 8Б класа разам з класным кіраўніком вядуць працу ужо некалькі гадоў: яны збіраюць матэрыялы аб месцах сваёй малой радзімы, дзе пакінула трагічны след Вялікая Айчынная вайна, наведваюць гэтыя памятныя месцы, знаёмяць з матэрыяламі даследавання ўсіх, каму цікава і карысна аб тым пачуць.



Настаўніца Сярэдняй школы № 11 г. Ліды Наталля Анашкевіч у сваім выступленні павяла гаворку аб трагічным следзе, які пакінула вайна ў жыцці яе сям’і. “Яна жыла за тых, хто не дажыў. Раік Ганна Аляксандраўна…”, так гучала заяўленая тэма. Выступленне стала асабліва кранальным і чулым, бо настаўніца распавядала аб выпрабаваннях, якія выпалі на лёс яе бабулі Ганны Аляксандраўны Раік, жыхаркі вёскі Барвічы Лідскага раёну. Калі чуеш аб трагедыі і асабістых стратах, гэта не можа нікога пакінуць абыякавым. У сваім выступленні Наталля Мікалаеўна падкрэсліла, наколькі важна і неабходна памятаць аб выпрабаваннях у жыцці родных. Памятаць і расказваць іншым дзеля таго, каб такіх трагедый больш не адбывалася ў нашым жыцці.

Хвілінай маўчання ўдзельнікі навукова-практычнай канферэнцыі ўшанавалі памяць загінуўшых падчас Вялікай Айчыннай вайны.

“Вайна і памяць: старонкі гісторыі Лідскага краю" - мерапрыемства, якое закранула не толькі значны гістарычны этап жыцця жыхароў Лідчыны і Беларусі ў цэлым, але і падняло актуальныя пытанні сучаснага жыцця паказала, як важна не толькі памятаць мінулае, але і шанаваць сучаснасць.

Юнкоры 8 «Б» класса

# Дапаможам разам хворым дзецям і зробім нашу прыроду чысцей!



На працягу некалькі гадоў вучні, бацькі і настаўнікі Сярэдняй школы № 11 г. Ліды прымаюць актыўны ўдзел у сацыяльна-экалагічным праекце “Новае жыццё ў абмен на крышачкі”. Не стаў выключэннем і гэты навучальны год.

Экалагічныя брыгады праводзілі інфармацыйныя хвіліны ва ўсіх классах, нагадваючы аб значнасці і неабходнасці рэалізацыі праекта і, тым самым, выхоўвалі ў дзяцей экалагічную культуру і міласэрнасць.

У наш час у Рэспубліцы Беларусь больш за 565 тысяч дзяцей і дарослых маюць інваліднасць, на лячэнне і рэабілітацыю якіх не хапае дзяржаўнага фінансавання, пры гэтым штогод у краіне на звалках утвараецца больш за 4 тысячы тон пластыкавых накрывак ад бутэлек з-пад напояў, бытавых парфумерыі і хіміі, кошт якіх складае каля 800 тысяч долараў. Нечаканая статыстыка.



Штодзень спецыяльныя кантэйнеры нашай установы адукацыі папаўняліся пластыкавымі крышкамі, і напрыканцы навучальнага года былі падведзены вынікі. Валанцёры падлічылі, што ўсяго было сабрана 58 кілаграм. Больш ўсяго крышачак сабралі вучні 8Б класа – 19 кілаграм. Калі, на першы погляд, камусьці падасца, што гэта не так і шмат, то паводле падлікаў вядома: 1 кг. – гэта 450 адзінак, а калі памножыць на 19, то атрымліваецца 8550 адзінак, а усяго па школе – 26100. І гэта толькі па адной школе Беларусі.

Жыццё пластыкавай крышкі даволі цікавае, але канец яе часта сумны. І для самой крышкі, і для планеты. Калі яны круцяцца па заводах, то гэта даволі захапляльна, калі знаходзіцца ў краме - цікава, але, калі іх пакупнік неадкладна адпраўляе ў смеццевае вядро, а потым камунальнікі – на звалку... Тут ужо сапраўды хочацца больш аптымістычнай канцоўкі. І яе можна перапісаць. Мы, вучні, бацькі і настаўнікі, СШ № 11 г. Ліды заклікаем: дапаможам разам хворым дзецям і зробім нашу прыроду чысцей!

Юнкоры 8Б класа СШ № 11 г. Ліды



# Тыдзень лесу - 2021

Лес – адно з прыродных багаццяў нашай краіны. На сённяшні дзень важнасць лясоў толькі ўзмацняецца за кошт таго, што іх колькасць прыметна памяншаецца. Унесці свой уклад у зялёны фонд нашай краіны можа кожны. У нашай школе акцыя “Тыдзень лесу – 2021” была прымеркавана да Года народнага адзінства.

Галоўная мэта нашага ўдзелу – папулярызацыя беражлівых адносін сярод навучэнцаў да аднаго з галоўных прыродных рэсурсаў краіны, уцягванне падлеткаў у прыродаахоўную дзейнасць, развіццё пачуцця дачынення да вырашэння экалагічных праблем.

На працягу тыдня настаўнікі і навучэнцы прынімалі ўдзел у розных мерапрыемствах.

Значны ўклад унеслі экалагічныя брыгады вучняў 8 - 11 класаў, якія займаліся ўборкай лесапаласы ў раёне завода “Ізатрон” горада Ліды. Навучэнцы прыбралі ад бытавога смецця плошчу ў 4 га.

## Учащиеся СШ 11 приняли активное участие в республиканском культурно- спортивном проекте "Вытокі. Крок да Алімпу"



# Пазнаёміліся з працай метролагаў у Лідскім цэнтры стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі





20 мая адзначаецца Сусветны дзень метралогіі. Вучні 8 «Б» класа Сярэдняй школы № 11 г. Ліды, працягваючы знаёмства з прадпрыемствамі і арганізацыямі Лідчыны ў рамках праекта "Эканоміка. Асоба. Будучыня", наведалі РУП "Лідскі цэнтр стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі" і пазнаёміліся ўласна з асаблівасцямі працы метролагаў.

Экскурсію для школьнікаў правёў начальнік метралагічнай службы Юрый Анатольевіч Кавалёў. Шмат новага і цікавага адкрылі для сябе вучні падчас наведвання арганізацыі.

Юрый Анатольевіч, расказваючы аб спецыяльнасці метролага, звярнуў увагу на тое, чым менавіта займаюцца на працоўных месцах супрацоўнікі, а гэта паверка і рамонт сродкаў вымярэння. Асноўнымі абавязкамі метралагічнай службы з’яўляюцца забеспячэнне дакладнасці вынікаў метралагічнага кантролю і выкананне патрабаванняў заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб забеспячэнні адзінства вымярэнняў. Як пераканаліся вучні, гэта вельмі неабходна і адказна.

Акрамя цікавай інфармацыі вучні мелі магчымасць непасрэдна наведаць і ўбачыць лабараторыі паверкі цеплатэхнічных, оптыка-фізічных, фізіка-хімічных, механічных, электрычных сродкаў вымярэнняў, лабараторыю выпрабаванняў і рамонту. Наведванне лабараторый дазволіла школьнікам уласна ўбачыць працоўныя месцы метролагаў.

Напрыканцы экскурсіі Юрый Анатольевіч звярнуў увагу юных экскурсантаў на тое, што ужо сёння яны павінны задумацца аб магчымасцях выбару будучай прафесіі. Чым больш ў вучня запас ведаў, тым больш магчымасцей будзе ў яго. А гэта вельмі важна пры вырашэнні і жаданні паступлення. Магчыма хтосьці з вучняў у будучым звяжа сваё жыццё з тэхнічнымі спецыяльнасцямі, тады адным з месцаў іх працы можа стаць Лідскі цэнтр стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі.

Юнкоры 8 «Б» класа



# СТОП-КАДР

*Послушай, читатель!.. Слышишь, как звенит школьный звонок, звонкий, радостный, заливистый? Он приглашает тебя на перемену. Теперь «Большая перемена» - в твоих руках. Это газета о школьниках и для школьников. Читай её и отдыхай!*

*Твоя «БП».*




## Дорога к храму

19 апреля в рамках проведения факультативного занятия "Основы православной культуры" учащиеся 8 б класса (педагог Н.Н. Анашкевич) Средней школы 11 г. Лиды познакомились со святынями города. Школьники посетили храм-памятник в честь Святого великомученика Георгия Победоносца, где встретились с настоятелем церкви протоиереем Ростиславом Соловьёвым. Священнослужитель рассказал о святынях храма и его истории.

**Больше фото смотрите на сайте школы во вкладке «Фотоальбомы»: https://11lida.schools.by/photoalbums**

## ГУО «СРЕДНЯЯ ШКОЛА № 11 г.Лиды»

**Республика Беларусь Гродненская обл.,**
**г. Лида ул. Интернациональная, 11** **Тел. 8-0154-652894; 8-0154-652891**
**Читайте нас https://11lida.schools.by/pages/press-tsentr**

**Руководитель школьного пресс-центра: Анашкевич Н.Н.**

**Редколлегия:** Видевич Л.М. *зам.директора по ВР,*
*Волынец Е.В., классный руководитель 5 «А» класса,*
*Белявская С.Л., классный руководитель 5 «Б» класса,*
*Лукомская Н.Ю., педагог организатор.*
*Ошмяна Л.Э., классный руководитель 11 класса,*
*Гебень И.С. Зам. директора по УР*

***Учащиеся:*** *юнкоры 5-11 классов.*

***Оформление: Анашкевич Н.Н. /учитель русского языка и литературы/***


14